№8 (171)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Красавік 2014 г.

КАЛОНКА НАВІН

У краіне

В Беларуси самый высокий уровень инфляции среди европейских стран.

В 2013 году инфляция в нашей стране составила почти 15%. На втором месте – страна, с инфляцией в 2,5 раза меньше – всего 6%.

Топ-5 стран с самой высокой инфляции в Европе выглядит следующим образом:

1 место: Беларусь, 14,9%

2 место: Россия, 6,1%

3 место: Великобритания, Финляндия, по 1,9%.

4 место: Эстония, 1,6%.

5 место: Австрия, Люксембург, по 1,5%.

Самая большая дефляция в 2013г. зафиксирована на Кипре - минус 1,6%. Вторую строчку заняла Греция - минус 1,4%. На третьем месте - Болгария (минус 1,3%).

У Прыдняпроўі

От ИП в бюджет Могилевской области за 1 квартал 2014 г. поступило Br82,7 млрд.

На учете в налоговых инспекциях Могилевской области по состоянию на 1 апреля 2014 г. состоит 25 089 индивидуальных предпринимателей. За 3 месяца текущего года они уплатили Br82,7 млрд. платежей в бюджет. По сравнению с аналогичным периодом 2013 г. поступления от индивидуальных предпринимателей увеличились на Br12,7 млрд.

У раёне

Старшынёй Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў абраны дэпутат райсавета па Міхалоўскай выбарчай акрузе № 17 Аляксандр Мікалаевіч Асіпёнак, які дагэтуль працаваў галоўным механікам БУКП “Жылкамгас”. Намеснікам старшыні — дэпутат па Чырвонаармейскай выбарчай акругі № 13, намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама Андрэй Аляксандравіч Ганчук.

АСТАП БЕНДЭР АДПАЧЫВАЕ…

У Бялыніцкім раёне ўзяліся за прымусовую працу ў пашыраным рэжыме.



Спачатку Бялыніцкі раённы выканаўчы камітэт, быццам бы па хадайніцтву працоўных калектываў БУКП“Жылкамгас”, ПМК-241, аддзела адукацыі спорту і турызму райвыканкама, установ адукацыі Бялыніцкага раёна, разгледзеў прапанову аб правядзенні агульнараённага суботніка і вырашыў яе падтрымаць, абвесціўшы правядзенне суботніка 5 красавіка.

Безадмоўныя, як аўтамат Калашнікава, працаўнікі Бялыніцкага раёна дружна адпрацавалі на суботніку, а пасля яшчэ і заплацілі свае сумленна заробленыя грошы са сваёй зарплаты за гэта сумнеўнае задавальненне.

Аднак нашы слаўныя раённыя ўлады вырашылі не спыняцца на дасягнутым і 12 красавіка зладзілі правядзенне яшчэ аднаго суботніка, на гэты раз рэспубліканскага.

Палымяныя бялыніцкія прыхільнікі папрацаваць бясплатна з вялікім задавальненнем (ва ўсялякім выпадку, так пішуць нашы “чэсныя” газеты) прынялі ўдзел у чарговым суботніку і з не меншым шчасцем зноў пералічылі грошы з заробкаў на невядома якую хрэнь.

Чэсна кажучы, у мяне ўжо з’явілася ўражанне, што ў родным Бялыніцкім раёне жывуць спрэч паслядоўнікі Паўла Карчагіна альбо барона Леапольда фон Захер-Мазоха. Як вядома, першы быў палымяным камуністам і не ўяўляў жыцця без дармавой працы на карысць радзімы, ну а другі атрымліваў задавальненне, калі яго дубасілі і прыніжалі.

Ну а як яшчэ можна падумаць, калі людзі добраахвотна пагаджаюцца працаваць задарма, а пасля яшчэ і пералічваюць за гэта “задавальненне” грошы? Тым больш, што ўжо амаль два месяцы супрацоўнікі самых розных арганізацый Бялыніцкага раёна літаральна вылізваюць

(Працяг на стар. 3)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

НЕ РУБИТЕ МУЖИКИ, НЕ РУБИТЕ!!!

Каждое утро, пять, а иногда и шесть раз в неделю, по дороге на работу, идя по ул. Якубовского, я прохожу мимо старого пруда, в народе называемого «Глинище», и каждый раз мне приходится вздрагивать при виде «кронированных» под столб деревьев, которые растут вокруг этого водоема.

Уже прошло несколько месяцев, как деревья обрезали, а привыкнуть я все равно не смог. Каждый раз я спрашиваю себя, это у кого такой утонченный вкус и как много тех, кому это по нраву? Есть ли какие-то правила кронирования? Как знать человеку, которого послали обрезать деревья, когда ему остановиться и сколько прутиков оставить торчащими из ствола, или вообще их не оставлять?

Как я понимаю, у линии электропередачи и у растительного мира разные эстетики, одно не может и не должно выглядеть, как другое. Провода не тянут по деревьям, но и дерево не должно выглядеть как столб. Если вы думаете иначе, то давайте спорить, и постарайтесь меня в этом переубедить.

По всем Белыничам торчат сотни изуродованных деревьев и «ласкают» чей-то взор. Но тем, которые пока еще торчат, повезло больше, чем тем, которые окончательно спилили. Столько лет они росли, и вдруг оказались не в том месте и не в то время, и их приказали спилить. Много лет назад большинство этих деревьев кто-то посадил и, возможно, на субботнике, когда их сажали именно в этом месте, их и хотели видеть. С годами мы все к деревьям привыкли, они нам нравились, они стали частью нашей жизни и окружения. Ведь именно всё это и называется МАЛАЯ РОДИНА. Это когда-то посаженный тобой клён под твоим окном, это речка, в которой ты купался, когда был еще ребенком, в которой поймал первую уклейку и был невероятно счастлив. Все это наша личная история, жизнь, которую мы прожили, то, что связывает нас с теми, кто был здесь до нас и оставил свой след. Не очень приятно видеть, когда это изменяется, и не в лучшую сторону.

Извините за лирику, без нее тоже не обойтись. Но я хочу Вам сказать, что не только лирика и ностальгия, но и закон на нашей стороне. А именно - статья 37 Закона Республики Беларусь от 14.06.2003 N 205-3«О растительном мире» говорит, что удаление объектов растительного мира возможно только при наличии разрешения местного исполнительного и распорядительного органа. При принятии решения о выдаче разрешения на удаление объектов растительного мира в населенных пунктах, местный исполнительный и распорядительный орган руководствуется заключением специально уполномоченных организаций о подтверждении обстоятельств, препятствующих эксплуатации зданий, сооружений и иных объектов, осуществляемой в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также использованию земельных участков по целевому назначению, либо о подтверждении нахождения объектов растительного мира в ненадлежащем, в том числе аварийном, состоянии. В соответствии с п. 8 Положения «О порядке выдачи разрешений на удаление объектов растительного мира в населенных пунктах и разрешений на пересадку объектов растительного мира в населенных пунктах» вопросы планируемого удаления объектов растительного мира подлежат обсуждению с общественностью.

Отделение от объектов растительного мира их частей, не влекущее утрату жизнедеятельности этих растений, могут производиться без разрешения местного исполнительного и распорядительного органа в соответствии с правилами проведения озеленения и нормативами в этой области.

Насколько я понял, согласно статье 37 данного Закона никто не может приказать спилить дерево под угрозой штрафа, а наоборот, должен спросить разрешения сделать это.

Короче говоря, ни большим, ни малым нарушать написанного в законе нельзя. Высокая должность в райисполкоме не дает право единолично решать, какому дереву расти, а какому нет. По каждому дереву должны проходить публичные обсуждения, и именно общественность должна решать, спиливать его, или оставить, а не те, кто через 3-4 года будет пилить деревья где-то еще. Ведь именно мы с вами останемся дальше жить на этой вырезанной делянке.



Мы, живущие в глубинке, часто не знаем законов и своих прав, мы больше знакомы с произволом чиновников и наивно полагаем, что это и есть ЗАКОН.

А ведь во многих случаях Закон на нашей стороне, мы только не знаем, где об этом прочитать и кто нам

(Окончание на стр. 8)

ВОРУЮТ, ОДНАКО…

14 апреля Белыничским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. 212 ч. 2 УК (Хищение путём использования компьютерной техники) в отношении неработающего могилевчанина, 1990 г.р., который 5 марта в 23-00 в банкомате по ул. Энгельса похитил 1 200 000 руб. со счета неработающего жителя д. М. Кудин, 1968 г.р. Раскрыто ОДО, ОУР, сообщает uvd.mogilev.by.

ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПЕНСИИ НА ГОСУДАРСТВО ПРИДЕТСЯ “ПАХАТЬ” НЕ ОДНО ДЕСЯТИЛЕТИЕ

Еще недавно было достаточно официально отработать пять лет, чтобы иметь право на получение минимальной пенсии. С нового года планку повысили до 10 лет. Однако, как оказалось, власти не намерены на этом останавливаться. И, как некогда в советские времена, сделано это будет “по просьбам трудящихся”.

Трудовой стаж с уплатой взносов в Фонд социальной защиты населения для получения трудовой пенсии в Беларуси необходимо увеличить. Такое предложение, как сообщает госагентство БелТА, было высказано накануне министру труда и социальной защиты Марианне Щеткиной в ходе встречи с трудовым коллективом ОАО “Дубровенский льнозавод”.



Сообщается, что одна из работниц предприятия якобы обратила внимание на то, что размер пенсии у людей, которые отработали несколько десятилетий, и тех, кто работал всего 10 лет, отличается незначительно. Выражая, как утверждает БелТА, общее мнение коллектива, она сказала, что это несправедливо.

На сей “трудовой порыв” Щеткина заметила, что с 1 января 2014 года продолжительность минимального трудового стажа, необходимого для назначения трудовой пенсии по возрасту и за выслугу лет увеличена до 10 лет.

Кстати, тогда чиновники Минтруда мотивировали увеличение минимального стажа работы необходимостью “сократить иждивенческие настроения” в обществе.

Позже, уже в конце января текущего года “пенсионной отработкой” занялись “депутаты”. Вопрос дальнейшего увеличения трудового стажа в числе прочих рассматривался на заседании комиссии “палатки” по труду и социальным вопросам.

И вот теперь желание властей заставить белорусов работать на государство как можно дольше подают уже как инициативу “трудового народа”, которую, естественно, поддержала министр Щеткина: “Я тоже считаю, что этого не достаточно. Будем прорабатывать вопросы в сторону увеличения страхового стажа”, - ответила Щеткина работнице “Дубровенского льнозавода”.

При этом министр еще раз подчеркнула, что в Беларуси не планируется повышать пенсионный возраст, но отметила, что достижение работниками 55 и 60 лет не является причиной для увольнения сотрудника. По ее словам, к этому возрасту люди становятся профессионалами своего дела, их опыт и знания могут быть полезными нанимателю.

“Белорусский партизан”

АСТАП БЕНДЭР АДПАЧЫВАЕ…

(Працяг. Пач. на стар. 1)

раён, фактычна працуючы дворнікамі і прыбіральшчыкамі “згодна складзенаму графіку”.

Аднак пасля я высветліў, што ўсё ж у родным раёне “мазахізм” пакуль не перамог. Паразмаўляў з цэлым шэрагам працаўнікоў ПМК-241, камунгаса, школ раёна і нават супрацоўнікаў райвыканкама і не знайшоў ніводнага, хто б ініцыяваў правядзенне гэтых “добраахвотных” суботнікаў па навядзенні парадку на зямлі з датковым да гэтага “добраахвотным” перапічэннем грошай за гэтае сумнеўнае задавальненне. Больш за тое, мае суразмоўнікі з бюджэтных і іншых арганізацый Бялыніцкага раёна як адзін абураліся, што з наступленнем цёплых дзён літаральна кожны тыдзень яны наводзяць “парадак на зямлі” ў працоўны час, і не толькі, высякаючы хмызняк, прыбіраючы фермы, дарогі, вуліцы і г. д. Што датычыцца супрацоўнікаў установ культуры і адукацыі раёна, дык тыя пад час гутарак сумна жартавалі, што іх установы ўжо патрэбна зачыніць, а іх саміх перавесці штатнымі прыбіральшчыкамі, бо апошнія месяцы яны толькі тэрыторыю Бялыніцкага раёна і прыбіраюць.

Мне нават патэлефанавалі некалькі асабліва мужных бялынічан і паскардзіліся на тое, як іх прыніжаюць, прымушаючы працаваць задарма на брудных працах і “здзіраючы” грошы за ўдзел у суботніках.

(Заканчэнне на стар. 7)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПРЫНЦЫП ДЗЕЙНАСЦІ КДК — «ШМАТ РУХАЎ, ДЫ МАЛА ЗРУХАЎ»

24 сакавіка Аляксандр Лукашэнка ў чарговы раз прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона. Адной з галоўных тэмаў, якія абмяркоўваліся на сустрэчы, стала дзейнасць узначаленай Якабсонам рабочай групы па вывучэнню праблемных пытанняў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы.

Старшыня КДК дакладаў кіраўніку дзяржавы, па якіх напрамках праводзіцца работа групы. Асноўныя высілкі, па яго словах, скіраваны на тое, каб скараціць затраты на жыллёва-камунальныя паслугі, у прыватнасці, бюджэтны складальнік за кошт больш рацыянальнага выкарыстання сродкаў».



«Мы там па многіх напрамках ідзём і прымаем шэраг мераў. Тады ўдзельная вага тых тарыфаў, якія плаціць насельніцтва, стане зусім іншай у агульным графіку. Гэта значыць мы не ідзём па шляху, што насельніцтва павінна плаціць больш, а наадварот — скарачэнне затрат», — сказаў Якабсон.

Ён адзначыў, што у сферы ЖКГ зараз прымаюцца меры па дыферэнцыяцыі аплаты, скасаванні пасярэдніцтва, змяненні структуры кіравання, пераліку норм і нарматываў на аказанне камунальных паслугаў, якія не пералічваліся з 2007 года. Работа па пераліку нарматываў павінна быць завершана да 1 мая.

Чытаючы, або слухаючы падобныя завярэнні старшыні такой сур'ёзнай, як падаецца на першы погляд, арганізацыі, грамадзяне нашай краіны і сапраўды могуць паверыць, што, нарэшце, у самы бліжэйшы час у сферы ЖКГ будзе наведзены парадак, і існуючаму бязмежжу чыноўнікаў прыйдзе канец.

Але ўчытаўшыся больш уважліва ў гэтыя словы, адразу ўсплывае ў памяці, што калісьці падобнае з вуснаў Якабсона ўжо гучала і не аднаразова.

Так, напрыклад, 30 мая 2012 года на паседжанні калегіі КДК ён адзначаў у сваім выступе аб шматлікіх фактах беспарадкаў і парушэнняў пры выкарыстанні дзяржаўных сродкаў і маёмасці ў ЖКГ Мінска, што былі выяўлены па выніках работы за 2010-2011 гады. У 25 правераных са 182 дзеючых на той час арганізацый ЖКГ горада неабгрунтаваныя страты склалі 48 млрд. рублёў. Па разліках старшыні КДК, агульны памер страт толькі дзяржсродкаў па гораду склаў каля 120 млрд. рублёў.

На калегіі адзначалася яшчэ і тое, што ў Мінску не выконваюцца задачы па рэфармаванню галіны, прадугледжаныя Канцэпцыяй развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі на перыяд да 2015 года, зацверджанай пастановай урада ў 2003 годзе. Паводле заключэнняў КДК, гэта ў значнай ступені з'яўляецца прычынай адсутнасці ў горадзе дзейснай сістэмы кіравання і кантролю ў сферы ЖКГ.

З тае пары прайшло два гады.

За гэты час пастановай Савета міністраў № 97 ад 8 лютага 2013 года «Канцэпцыя развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь да 2015 года» ўжо прызнана страціўшай сілу.

А Якабсон усё яшчэ працягвае размову аб наяўнасці шматлікіх фактаў неэфектыўнага выкарыстання бюджэтных сродкаў, толькі ўжо ў маштабе краіны.

Тое, што фінансавыя сродкі ў сферы ЖКГ расходваюцца, мякка кажучы, неэфектыўна, ведаюць у нашай краіне ўсе, ад малога да старога. Грамадзянам хацелась бы пачуць аб эфектыўных мерах КДК па недапушчэнні разбазарвання фінансаў, паляпшэнню якасці працы галіны і якасці камунальных паслугаў.

Як так склалася, што ў сферу ЖКГ распараджэннямі кіраўнікоў выканаўчых структураў рэгіёнаў былі перададзены некаторыя віды непрофільнай дзейнасці і шматлікія аб'екты непрофільнай маёмасці, утрыманне якіх абыходзіцца галіне ў сотні мільярдаў рублёў?

А гэтыя сродкі можна было б скіраваць на капітальны рамонт жылога фонду, рамонт абсталявання аб'ектаў ЖКГ, добраўпарадкаванне тэрыторый і т.д.

Толькі ў Магілёўскай вобласці на баланс арганізацый ЖКГ незаконна перададзена каля 200 непрофільных аб'ектаў, на ўтрыманне і абслугоўванне якіх за 2013 год камунальнікі патрацілі каля 9 млрд. рублёў. Большыня гэтых аб'ектаў была раней разрабавана, абсталяванне знікла ў невядомых накірунках.

А як, напрыклад, можна зразумець распараджэнне магілёўскіх уладаў аб неабходнасці набыцця гарадскім водаканалам цеплахода за 420 тыс. доляраў для арганізацыі

(Заканчэнне на стар. 5)

ПРЫНЦЫП ДЗЕЙНАСЦІ КДК — «ШМАТ РУХАЎ, ДЫ МАЛА ЗРУХАЎ»



(Заканч. Пачатак на стар. 4)

турыстычных водных маршрутаў, калі ў Магілёве існуе і рачны порт, і ўпраўленне спорту і турызму… Гэтыя сотні тысяч долараў разам са сродкамі на ўтрыманне аб'екта, якія пры гэтым нават не акупляюцца, ляглі велізарным цяжарам на сабекошт паслугаў водаканала і, як след, на плечы гараджан.

А магілёўскія ўлады за кошт грамадзян адсправаздачыліся пра паспяховае стварэнне новай турыстычнай паслугі.

Пшыкам на сённяшні дзень сталася і чарговае рашэнне працоўнай групы па ЖКГ аб неабходнасці правядзення аблвыканкамамі да 1 красавіка 2014 года інвентарызацыі ўсіх непрофільных актываў, вызначэння парадку іх далейшага выкарыстання, крыніц фінансавання і парадку перадачы па адпаведных галінах для далейшага кіравання.

Пры, як падаецца на першы погляд, актыўнай дзейнасці працоўнай групы па ЖКГ і КДК у навядзенні парадку ў сферы ЖКГ, за апошнія гады не было практычна рэалізавана ніводнай іх прапановы, не было прынята юрыдычных захадаў для вызначэння і ліквідацыі прычынаў «неэфектыўнага» выкарыстання фінансавых сродкаў.

І, як можна заўважыць, Аляксандр Якабсон у сваіх справаздачах імкнецца маляваць толькі верхнюю, бачную частку «айсберга» фінансавых праблемаў ЖКГ, неабцяжарваючы сябе працай для паказу беларускім грамадзянам і кіраўніцтву дзяржавы яго значна большай «падводнай» часткі.

А каб паказаць гэтую «падводную» частку, неабходна напачатку задацца простым пытаннем. Чаму беларускім урадам прынята пастанова аб прызнанні Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2015 года як страціўшай сілу, і куды падзеліся шматмільярдныя, ў доларах, фінансавыя сродкі, што ўсе гэтыя гады скіроўваліся на выкананне разнастайных праграм з гэтай Канцэпцыі?

Рыгор Кастусёў

ШКЛОВСКИЙ ЖИЛКОМХОЗ ПУСТИЛ ДЕНЬГИ НА МУСОР

Наши соседи, славные шкловские коммунальники, не смогли собрать части купленного оборудования для сортировки мусора. В результате оборудование само стало мусором.

Бесхозяйственность и нецелевое использование бюджетных средств принесли ущерб государству 106 миллионов рублей, сообщили в КГК Могилёвской области.

Госконтроль в рамках деятельности межведомственной рабочей группы по изучению проблемных вопросов в сфере ЖКХ обнаружил новые факты бесхозяйственности или, как выражается наш президент, “головотяпства” славных работников ЖКХ.

В очередной раз отличиличь руководители шкловского УКП «Жилкомхоз».

Предприятию из бюджета были выделены средства на приобретение оборудования для создания сортировочной станции по переработке отходов, (кстати,она должна была быть смонтирована еще в 2005-ом году). К полученной сумме Жилкомхоз добавил свои деньги, получив в результате 25 тысяч долларов в эквиваленте. На эти деньги было куплено оборудование.

Проблема в том, что разные части комплекта были приобретены у разных поставщиков. В результате коммунальники не смогли собрать их в единую конструкцию. Бесполезное оборудование отправилось на склад и постепенно разворовывалось.

Кстати, подобная безалаберность стала нормой для предприятий ЖКХ. По информации КГК Могилевской области коммунальниками региона было закуплено 15 станций по сортировке коммунальных отходов. Десять из них в настоящее время не используются.

Сейчас решается вопрос о привлечении к уголовной ответственности должностных лиц Шкловского УКП “Жилкомхоз”.

Примечательно, что после увольнения с должности по политическим мотивам бывшего директора Шкловского жилкомхоза, “проклятого наёмника злобных буржуинов” Костусева, почти все его преемники на этой должности уходили с неё прямиком “на нары”…

Ждём очередной “посадки”?

Сергей Семенович

АНДРЭЙ ПАЛУДА: "КАЛІ ДЗЯРЖАВА ЛІЧЫЦЬ, ШТО СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ СТРЫМЛІВАЕ ЗЛАЧЫННАСЦЬ, ТО ЧАМУ ЎТОЙВАЕ ІНФАРМАЦЫЮ ПРА СМЯРОТНЫЯ ПРЫСУДЫ"?

Наш зямляк, праваабаронца Андрэй Палуда, які з'яўляецца каардынатарам кампаніі "Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі", разглядае самыя папулярныя аргументы "за" і "супраць" смяротнага пакарання і аналізуе грамадскую думку беларусаў на гэтую тэму.

- Андрэй, прадстаўнікі ўлады ў абароне смяротнага пакарання часта спасылаюцца на грамадскае меркаванне і вынікі рэферэндума ў 1996. Маўляў, гэта рашэнне беларускага народа, нельга ісці супраць яго. Ці сапраўды большасць беларусаў сёння выступае за смяротнае пакаранне?

- Калі спасылацца на апошнія даследаванні, якія рабіла кампанія Satio, сапраўды, большасць беларусаў выступае за смяротнае пакаранне. Але гэта вельмі зменлівая сітуацыя. Нават калі ўзяць пад увагу вынікі рэферэндума, легітымнасць якога незалежныя эксперты і праваабаронцы ставяць пад сумнеў, з 1996 года вырасла ўжо новае пакаленне, якое тады не галасавала. І як паказваюць апытанні, большасць маладзёнаў супраць смяротнага пакарання. Таксама хачу адзначыць, што калі быў судовы працэс над Кавалёвым і Канавалавым, грамадства яскрава падзялілася на тых, хто выступае за і супраць найвышэйшай меры пакарання. Ізноў такі, калі паглядзець на вынікі апытання, многія за смяротнае пакаранне, але пры пэўных умовах – "калі б у Беларусі была незалежнай судовая сістэма", "калі б у Беларусі быў суд прысяжных", "калі б віна злачынцы была даказаная на 100%" і г.д. І гэтыя ўсе ўмоўнасці кажуць, што многія беларусы так і не маюць упэўненага адказа на пытанне пра смяротнае пакаранне.

- Вы адзначылі пункт пра незалежнасць судовай сістэмы. Сапраўды, і даследаванне Satio, і іншыя апытанні паказваюць, што беларусы не давяраюць судовай сістэме. Як вы думаеце, у чым прычына? Далёка не кожны ж асабіста сутыкаўся з несправядлівасцю ў судзе…

- Калі паглядзець на колькасць адміністратыўных пакаранняў па краіне, то можна казаць, што, напэўна, кожны беларус ці сам, ці праз сваіх сваякоў сутыкаўся непасрэдна і з нашай судовай сістэмай, і з праваахоўчай. І на сабе адчуў і залежнасць гэтых органаў ад рэжыма, і недасканаласць заканадаўства. Да таго ж, хапае ў нас незаконна асуджаных грамадзянаў. Яскравы прыклад – Міхаіл Гладкі, якога асудзілі на 8 год пазбаўлення волі нібыта за забойства брата. А калі ён ужо выйшаў на волю, знайшлі нібыта сапраўднага злачынцу, Эдуарда Лыкава, якому, дарэчы, вынесены смяротны прысуд.



- Дарэчы, аб справе Лыкава грамадскасці стала вядома толькі пасля заяваў ад праваабаронцаў. Чаму праваахоўчыя органы і суд вырашылі замаўчаць такую гучную справу – усё ж такі чалавека абвінавачваюць у пяці забойствах?

- Сапраўды, першымі пра гэту справу паведамілі "Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі". Пасля тэму актыўна пачалі раскручваць журналісты. Суд і Следчы камітэт ужо вымушаныя былі каментаваць сітуацыю. Гэта яшчэ раз падкрэслівае, што дзяржава ўтойвае інфармацыю аб вынясенні смяротных прысудаў і іх выкананне. Адпаведна, мы не можам да канца быць упэўненыя ў лічбах, якія прадастаўляюць дзяржорганы. З аднаго боку, чыноўнікі кажуць, што смяротнае пакаранне дапамагае стрымліваць злачыннасць у грамадстве. Але тады чаму яны маўчалі пра справу Лыкава? Чаму не паведамілі пра гэтыя пяць забойстваў, калі яны так зацікаўленыя спыніць і прадухіліць цяжкія злачынствы ў краіне? Выходзіць, не спрацоўвае іх аргумент!

- Апошнім часам можна заўважыць, што тэма смяротнага пакарання стала цікавай не толькі для праваабарончых сайтаў, але і для дзяржаўных і недзяржаўных СМІ. Матэрыялы на гэту тэму збіраюць тысячы праглядаў і каментароў…

- Сапраўды, тэма смяротнага пакарання стала медыйнай. Гэта вельмі важна для нас, кампаніі "Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі", бо яшчэ год-два таму не было ў СМІ такога актыўнага абмеркавання.

- Але часта каментатары выказваюцца ў абарону смяротнага пакарання, прычым у вельмі рэзкай і жорсткай форме…

- На гэтым этапе, я лічу, важна не

(Заканчэнне на стар. 7)

АНДРЭЙ ПАЛУДА...

(Заканч. Пачатак на стар. 6)

тое, за якую пазіцыю людзі выказваюцца, а тое, што яны наогул дыскутуюць. Меркаванне можа змяніцца толькі тады, калі людзі пачуюць важкія аргументы. Да таго ж, аргументы за адмену смяротнага пакарання часта становяцца "топавымі", збіраюць найбольш "лайкаў" – гэта кажа аб падтрымцы такой пазіцыі сярод карыстальнікаў інтэрнэта.

- У каментарах часта можна пачуць меркаванне – навошта нам, падаткаплацельшчыкам, утрымліваць пажыццёва злачынцу (як альтэрнатыва – смяротнаму пакаранню), хай гэтыя грошы лепш пойдуць на сацыяльную сферу. Ці сапраўды для бюджэта гэта такая агромністая сума?

- Насамрэч гэта лічба мізерная. Адзін з удзельнікаў нашай дыскусіі па тэме смяротнага пакарання падлічыў, што на ўтрыманне злачынцы ідзе прыкладна 150 тыс. руб. у суткі, або 4.5 млн. руб. у месяц. Насельніцтва Беларусі складае прыкладна 9,464 млн. чалавек. Калі палічыць, выходзіць, што ў месяц на ўтрыманне асуджанага грамадзянін марнуе менш адзін рубель (!) - усяго 0.475 руб. Але бываюць выпадкі, калі асуджаюць невінаватых. Значыць , бываюць і выпадкі, калі караюць смерцю невінаватых - яскаравы прыклад справа Міхасевіча ў Віцебску. Таму я б хацеў спытаць у тых, хто адстойвае аргумент пра ашчаджэнне дзяржаўных сродкаў - ці варта такая эканомія чалавечых жыццяў?


- Яшчэ адзін з папулярных аргументаў за смяротнае пакаранне – суразмернасць пакарання. Маўляў, калі злачынца кагосьці забіў, ён заслугоўвае роўна таго ж...

- Вельмі слушна пра гэта сказаў Гандзі: "Прынцып вока за вока робіць свет сляпым". У беларускім грамадстве вельмі нізкі ўзровень асветы ў галіне правоў чалавека дый права наогул. Калі пачынаеш праглядаць розныя фільмы, артыкулы праз прызму правоў чалавека, то ты па-іншаму ўспрымаеш рэчаіснасць. Я як праваабронца ведаю, што чалавек пры нараджэнні атрымлівае правы, і яны з'яўляюцца неад'емнымі, найперш – права на жыццё.

І я яшчэ раз хачу вярнуцца да тэмы доказнасці віны і працы нашай судовай сістэмы. На жаль, мы маем сёння прыклады, калі невінаватыя людзі знаходзяцца за кратамі. У 80-я за справу ман'яка Міхасевіча адзін чалавек быў расстраляны, яшчэ некалькі несправядліва адпраўленыя ў турму, з іх праз катаванні выбілі прызнанні... У любым выпадку, судовая сістэма ў любой краіне свету можа памыляцца. Я асабіста знаёмы з чалавекам, які ў ЗША быў прыгавораны да смяротнага пакарання. 24 гады ён прасядзеў у турме ў Фларыдзе. Але пасля экспертызы ДНК яго вызвалілі, бо высветлілася, што ён быў невінаваты. Калі паглядзець, як хутка ў Беларусі выконваюцца смяротныя пакаранні (Уладзіслава Кавалёва, напрыклад, расстралялі праз 3,5 месяцы пасля вынясення прысуду), баюся, гэты чалавек у нашай краіне проста не дачакаўся б ні паўторнай экспертызы, ні вызвалення, нягледзячы на сваю невінаватасць. Маючы на ўвазе ўсе гэтыя аргументы, мы выступаем катэгарычна супраць найвышэйшай меры пакарання ў Беларусі.

spring96.org

КРЫЧАЎСКІ СУД ПАЧАЎ РАЗГЛЯД СПРАВЫ СУПРАЦЬ ДЫРЭКТАРА, ЯКІ ПАБІЎ ПАДНАЧАЛЕНАГА



Суд Крычаўскага раёна пачаў разгляд справы па абвінавачванню былога дырэктара КСУП "Добрасць" Сяргея Гудына ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў.

Як паведамляе незалежная газета "Вольны горад" (№5 ад 13 красавіка 2014 года), падсуднаму інкрымінуецца некалькі фактаў па артыкулу 426 ч. 2 Крымінальнага кодэкса РБ, па справе маецца некалькі пацярпелых.

Неабходна адзначыць, што дырэктар КСУП "Добрасць" быў затрыманы ў лістападзе 2013 года па падазрэнню ў збіцці механізатара гэтага сельгаспрадпрыемства. Пасля канфлікту з механізатарам, які знаходзіўся на працоўным месцы ў нецвярозым стане, дырэктар КУАП "Добрасць" Сяргей Гудына спачатку абразіў падначаленага, а потым яго пабіў. Пазней высветлілася, што такія неадэкватныя паводзіны дырэктар сельгаспрадпрыемства дазваляў сабе і раней.

Барыс Вырвіч

АСТАП БЕНДЭР АДПАЧЫВАЕ…

(Заканч. Пачатак на стар. 1, 3)

Праўда, гэтыя "мужныя" людзі вельмі прасілі не ўказваць іх прозвішчы і чамусьці не рэагавалі на парады невыконваць не адпавядаючыя закону загады. Бо нават тыя ж самыя суботнікі – справа абсалютна добраахвотная, і вы можаце ў іх не ўдзельнічаць, калі не хочаце, пасылаючы пры гэтым аддаючае нейкія незаконныя загады кіраўніцтва вельмі далёка. Я ўжо не кажу пра тое, калі вас адпраўляюць на нейкую, не прадугледжаную працоўнай дамовай, працу – проста паглядзіце КзаП, і вам усё стане зразумелым.

Таксама заўсёды ёсць магчымасць звярнуцца ў пракуратуру Бялыніцкага раёна, якая павінна адсочваць выкананне беларускага заканадаўства аб працы ў нашым раёне.

Ну а калі вы кажаце "мы баімся", то тут мая парада – тады ўступайце ў шэрагі прыхільнікаў барона фон Захер-Мазоха і атрымлівайце задавальненне ад таго, што вас "дручаць". Ці можа вы ведаеце нейкі іншы варыянт?

Тым больш, што бялыніцкія ўлады ужо рыхтуюць чарговы суботнік…

Іван Барысаў

С ЧЕГО НАЧИНАЕТСЯ ГАДИНА?



С чего начинается гадина?
С удушливой лжи по ТВ,
С попов, пешеходов таранящих
На "Лексусах" и "БМВ".

А может, она начинается
С той первой абхазской войны,
С тех криков, и плачей, и выстрелов,
Что не были русским слышны?

С чего начинается гадина?
С невтоптанных в грязь кумачей,
С портретов тирана усатого,
И чествованья палачей.

А может, она начинается
С той мантры про "Родину-Мать",
Не просто с незнанья истории,
А и с нежелания знать?

С чего начинается гадина?
С креста перед входом в МИФИ,
С гламурной накрашенной курицы,
Которой политика - фи.

А может, она начинается
С завистливой злобы раба,
С мечты, чтоб соседу свободному
Скорей наступила труба?

С чего начинается гадина?
С парадов и олимпиад,
С вельможно-холуйского барина,
Что лижет начальственный зад.

А может, она начинается
С дворцов и офшоров вдали
И с маленьких глупых гаденышей,
Что курс Селигера прошли?

С чего начинается гадина?
С истерики на площадях,
С надкрыльев жука колорадского
На невоевавших бля-ях.

А может, она начинается
С "портянок" и "ботов" сетей,
С уменья воспитывать ненависть
Ко всем, кто не любит плетей?

С чего начинается гадина?
С визгливых имперских понтов,
С орущих под флагами гопников
И лупящих женщин ментов.

А чем же закончится гадина
Всея озверелой Руси?
Спроси у повешенных в Нюрнберге,
Саддама Хусейна спроси...

© Юрий Нестеренко, март 2014

НЕ РУБИТЕ МУЖИКИ, НЕ РУБИТЕ!!!

(Оконч. Начало на стр. 2)

поможет отстоять свои права. Общаясь с юристами из общественного объединения «Экодом», я услышал такую фразу: «Если в Законе четко не написано «гражданин обязан», то многие требования спилить или кронировать деревья являются, как минимум, спорными».

Когда экологи узнали о том, что происходит в Белыничах, и как у нас относятся к Закону «О растительном мире», у них возникли вопросы, которые они направили в Белыничский райисполком.

Вот они:

1) На основании, каких правил и технических правовых актов было и кем было принято решение произвести отделение частей объектов растительного мира методом «под столб» на пересечении улиц Калинина и Якубовского?

2) На основании, какого решения было произведено удаление объектов растительного мира и на основании, какого заключения оно принималось?

3) По какой причине не проводилось общественные обсуждения по вопросу удаления объектов растительного мира?

Что же, будем ждать ответа наших белыничских чиновников, который мы обязательно опубликуем в газете, частично или полностью.

Пока чиновники отвечают, давайте не сидеть, сложа руки, а давайте делать то, что в наших силах.

Если Вам известны факты, кронирования «под столб» или уничтожения зеленых насаждений, обращайтесь в общественную организацию «Экодом», звоните или пишите по адресу:

Общественное объединение **"Экодом"**, 14, ул. Зеленая, д. Комарово, Свирский п/с, Мядельский р-н, Минская обл., 222394, Беларусь

для корреспонденции: 38, ул. Новиленская, 220053, г. Минск.

e-mail: ecohome.by@gmail.com

тел/факс: (017) 3354725

Пётр Шимбалёв

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем выдаўца газеты.

Адрас рэдакцыі: 213173, Бялыніцкі раён, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 17.04. 2014 г. у 08-00.